1. *Выпішыце назоўнікі*

Халодная, воўк, праўда, смяяцца, космас, цёмны, цішыня.

Высокі, сабака, холад, расказаць, ураджай, мяккі, шчасце.

Вясна набірае сілы. Буйна паднялася трава. Шумяць густымі кронамі лісцевыя дрэвы. Дзядуля пасадзіў маладую вішаньку. Расло дрэўца. Зялёныя лісточкі радасна сустракалі сонца.

2. *Праскланяйце назоўнікі*

Мыш, дождж, ліса

Бабуля , горад, радасць

3. *Абазначце скланенне назоўнікаў.*

Вер.бей, - б.роза- , насе (н, нн) е,- фламаст.р,--- дзя.чынка- ….

глуш-…. .

Мыш- ….. , ня….еля,- ж….ццё,- дзё (н, нн)ік- , бал.рына-. гусь-…..

4. *Выпішыце словазлучэнні з назоўнікамі ў давальным склоне.*

Падысці да чыгункі, дараваў дачцэ, расказаць сяброўцы, радавацца сонцу, быў на сустрэчы.

Купілі брату, прысвяціў гораду,запытаць у паштальёна, дзякаваць бацьку, замахнуўся кап'ём.

5. *Спішыце. Вызначце склон назоўнікаў .*

Раніцай Волечка ішла (у,ў) школу. Каля дарогі р.слі прыгожыя рамонкі.

Дзяўчынка захацела нарва.ь букет кветак.

Стаяла глыбокая ціш..ня. Патрэсківалі (пад) н..гамі сухія галінкі. Летняе сонца суш..ла (на) з..ленай траве чырвоныя пацеркі.

6. *Пастаў назоўнік, што ў дужках, у патрэбным склоне. Абазнач у гэтых словах канчатак і склон.*

К (старасць) людзі становяцца мудрэйшымі. На (поўнач) паўгода цягнецца зіма. Без (соль) і смаку не пачуеш.

Над (зямля) узнімалася халоднае зімовае сонца. Месяц люты славіцца (вецер) і моцнымі (маразы). Мароз намаляваў на (акно) цудоўныя ўзоры.

7. *Складзі і запішы сказы. Абазнач склон назоўнікаў.*

узняўся, пад, вецер, моцны, вечар

сняжок, пасыпаў, гусценькі

хмары, над, навіслі, нізка, зімовыя, зямлёй

крапчэў, усё, вецер

хмары, забегалі, па, сівыя, небе

вецер, падняўся, моцны

глуха, стары, зашумеў, лес

круціць, белымі, вецер, стаўбамі, снег

8. *Пастаў назоўнікі ў форму давальнага склону адзіночнага ліку і ў форму творнага склону адзіночнага ліку.*

Н.скл. траўка, страха, возера, восень, радасць, дачка, муха, сшытак, глуш, мясцовасць

Д.скл.

Т.скл.